# СЁННЯ — ДЗЕНЬ ЯДНАННЯ НАРОДАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ



РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 КРАСАВІКА 2025 г. СЕРАДА № 64 (30452)

КАБ ПАМЯТАЛІ

# НАШЧАДКІ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

**У Мінску праходзіць беларуска-расійскі маладзёжны форум**



Прадстаўнікі ўсіх гарадоў-герояў Беларусі і Расіі сабраліся гэтымі днямі ў Мінску. У нашай краіне праходзіць маладзёжны форум «Нашчадкі Вялікай Перамогі», які прымеркаваны да 80-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Каля паўсотні ўдзельнікаў з Мінска, Масквы, Санкт-Пецярбурга, Валгаграда, Мурманска, Смаленска, Тулы, Керчы, Новарасійска, Севастопаля і Брэста не толькі пазнаёмяцца з памятнымі мясцінамі Беларусі, такімі як Хатынь, Курган Славы, Брэсцкая крэпасць, але і раскажуць пра гераічнае мінулае свайго горада, падзеляцца асабістым вопытам работы па захаванні гістарычнай памяці. Мерапрыемства арганізавана Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі.

СТАР. 4–5

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

МІЖРЭГІЯНАЛЬНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА: БУДЗЕМ СЯБРАВАЦЬ! МС



ЧАМУ ГІНУЦЬ ЖУРНАЛІСТЫ? 12




Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25064

9 771990 763008

НОВЫ ПРАЕКТ «ЗВЯЗДЫ»

# МАТЭРЫЯЛЬНЫЯ СВЕДЧАННІ ПОДЗВІГУ




**Беларусь стала першай краінай свету, якая стварыла музей, прысвечаны падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Прычым экспанаты пачалі збіраць у адзін з найцяжэйшых перыядаў — калі беларусы знаходзіліся пад акупацыяй. Па прадметы ваеннага часу, якія пасля сталі рэліквіяй, музейныя супрацоўнікі выязджалі ў франтавую зону, партызанскія злучэнні, на эвакуяваныя ў савецкі тыл беларускія прадпрыемствы. У рэспубліканскую камісію, якая займалася зборам экспазіцыі, свае рэчы, баявыя трафеі прыносілі ўдзельнікі і відавочцы тых падзей.**

**Сімвалічна, што ў год святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў музей набыў новы дом. Дзякуючы вялікай працы і прафесіяналізму шырокага кола людзей створана экспазіцыя, якая аб'ектыўна расказвае аб гераічных і трагічных падзеях у лёсе не толькі Беларусі, але і ўсяго свету. Тут захоўваюцца рэчы людзей, якія ў тым ліку цаной уласнага жыцця здабылі нам Перамогу. Аб унікальных экспанатах — сумесны праект «Звязды» і Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны «Рэчы салдат Перамогі: гісторыя аднаго экспаната».**

СТАР. 11

# ДЗЕЛЯ НАШАЙ АГУЛЬНАЙ АЙЧЫНЫ



*Дарагія сябры!*

*Прыміце шчырыя віншаванні з Днём яднання народаў Беларусі і Расіі.*

*2 красавіка — знакавая для беларусаў і расіян дата, якая стала сімвалам сапраўднага братэрства, змацаванага сумесным гістарычным мінулым, культурнай і духоўнай агульнасцю, шматлікімі роднаснымі і сямейнымі сувязямі.*

*Нас звязваюць шматгадовыя традыцыі дружбы і ўзаемавыручкі, якія ўвабралі ў сябе веліч агульных перамог, цяжар складаных выпрабаванняў, горыч неймаверных страт і радасць стваральнай працы.*

*Сёння мы разам будуем нашу будучыню, абапіраючыся на ўзаемны давер і падтрымку. Рэалізацыя маштабных саюзных праграм, кааперацыя ў сферах эканомікі, навукі і тэхналогій адкрываюць для беларуска-расійскага партнёрства новыя, практычна бязмежныя гарызонты магчымасцяў. Поспехі ў атамнай энергетыцы, касмічных даследаваннях, машынабудаванні і мікраэлектроніцы сталі важнымі прыступкамі на шляху да дасягнення тэхналагічнага суверэнітэту і імпартанезалежнасці.*

*Дабрабыт людзей — прыярытэт інтэграцыйнага праекта. Роўныя правы, сацыяльныя гарантыі, свабода выбару і доступ да якасных паслуг у медыцыне, адукацыі, пенсіённага забеспячэння застаюцца яго непарушнай асновай. Адзіная адукацыйная, інфармацыйная, культурная прастора дазваляе кожнаму грамадзяніну Беларусі і Расіі адчуваць сябе часткай вялікага цэлага — нашай агульнай Айчыны.*

*Сучаснае жыццё пераканаўча дэманструе, што толькі разам мы зможам паспяхова супрацьстаяць выклікам часу.*

*Вялікая Перамога, 80-годдзе якой мы будзем адзначаць зусім хутка, доказала неаспрэчную ісціну: пакуль мы разам — мы несакрушальныя.*

*У гэты ўрачысты дзень ад усёй душы жадаю вам, дарагія сябры, добрага здароўя, дабрабыту, сямейнага цяпла і міру. Няхай нашы агульныя намаганні ўмацоўваюць адзінства, а супрацоўніцтва Беларусі і Расіі служыць залогам працвітання будучых пакаленняў.*

**Старшыня Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы,**
**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# «ТРЭБА АРЫЕНТАВАЦЦА НА СВАЁ»

**На сустрэчы з дэлегацыяй Пензенскай вобласці Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на важным для супрацоўніцтва**



Фота БелТА.

У Палацы Незалежнасці — госці з Расіі. Гэтым разам з Пензенскай вобласці, дэлегацыя якой на чале з губернатарам Алегам Мельнічэнкам знаходзіцца ў нашай краіне. Па традыцыі, з кіраўніком расійскага рэгіёна і членамі дэлегацыі сустрэўся і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Праграма візіту вельмі насычаная. І, як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, гэта вельмі правільна, бо госці з Пензенскай вобласці прыехалі ў Беларусь напярэдадні значных свят — Вялікадня і 80-годдзя Вялікай Перамогі. Паколькі візіт дэлегацыі прыпаў і на Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі, госці з Пензенскай вобласці актыўна паўдзельнічаюць у святочных мерапрыемствах.

# ДЛЯ КАНКУРЭНТНЫХ ПЕРАВАГ І ТЭХНАЛАГІЧНАЙ БЯСПЕКІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 1 красавіка падпісаў указ № 135, якім зацверджаны прыярытэтныя кірункі навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці ў краіне на 2026—2030 гады, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

У якасці такіх кірункаў вызначаны найбольш перспектыўныя і запатрабаваныя для дзяржавы сферы дзейнасці, якія даюць магчымасць у сярэднетэрміновай перспектыве забяспечыць актуальныя вынікі ў навукаёмістых і высокатэхналагічных сектарах эканомікі, канкурэнтныя перавагі і тэхналагічную бяспеку краіны. Гэта лічбавыя тэхналогіі і штучны інтэлект, інавацыйныя тэхналогіі ў прамысловасці, біялагічныя і медыцынскія тэхналогіі, інавацыйныя тэхналогіі ў аграпрамысловым комплексе і харчовай прамысловасці, навуковае і навукова-тэхнічнае забеспячэнне бяспекі чалавека, грамадства і дзяржавы.

Указам устанаўліваецца, што першачарговай рэалізацыі будуць падлягаць скразныя кірункі міжгаліновага характару, вынікі якіх аказваюць істотны ўплыў на развіццё некалькіх галін эканомікі і сацыяльнай сферы.

У адпаведнасці з прыярытэтамі будуць сфарміраваны і зацверджаны дзяржаўныя праграмы навуковых даследаванняў, навукова-тэхнічныя праграмы, Дзяржаўная праграма інавацыйнага развіцця Беларусі на 2026—2030 гады. Пры гэтым узмоцнена роля кіраўнікоў дзяржаўных заказчыкаў праграм. На іх ускладзена персанальная адказнасць за эфектыўнае выкарыстанне сродкаў, своечасовае выкананне заданняў і дасягненне запланаваных вынікаў.

Указ накіраваны на кансалідацыю навуковага, адукацыйнага і вытворчага патэнцыялу, канцэнтрацыю матэрыяльных і інтэлектуальных рэсурсаў на рэалізацыі найбольш значных для забеспячэння тэхналагічнага суверэнітэту краіны кірункаў навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці.

Указ, падпісаны кіраўніком дзяржавы, вельмі важны ў трох сферах дзейнасці — навуковых даследаванняў, распрацовак і рэалізацыі інавацыйных праектаў, адзначыў, каментуючы гэты дакумент, **старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, кандыдат ваенных навук, дацэнт Сяргей ШЛЫЧКОЎ.**

— Указ з'яўляецца базавым дакументам, які дазваляе забяспечваць комплексны падбор праектаў і прымаць рашэнні па бюджэтным фінансаванні перш за ўсё найбольш актуальных тэм навуковых даследаванняў і распрацовак, — сказаў кіраўнік ДКНТ. Распрацоўваўся ўказ з 2023 года, заначыў ён.

— У 2023—2024 гадах мы распрацоўвалі комплексны прагноз навукова-тэхнічнага прагрэсу на наступныя пяць гадоў. Распрацаваны ён як даведнік праектных ідэй, што найбольш актуальныя і эфектыўныя для рэалізацыі ў наступнай пяцігодцы. Пералік прыярытэтаў быў сфарміраваны зыходзячы з вынікаў комплекснага прагнозу, — падкрэсліў Сяргей Шлычкоў.

Прыярытэтнымі кірункамі навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь указам вызначаны штучны інтэлект і лічбавыя тэхналогіі; інавацыйныя тэхналогіі і тэхніка ў прамысловасці; біялагічныя, хіміка-фармацэўтычныя і медыцынскія тэхналогіі і прадукты; інавацыйныя тэхналогіі ў аграпрамысловым комплексе і харчовай прамысловасці; навуковае і навукова-тэхнічнае забеспячэнне бяспекі чалавека, грамадства і дзяржавы.

**— Як і ў гэтай пяцігодцы, першы прыярытэт — усё, што звязана з «лічбай», — пракаментаваў старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях.**

Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі сёння стварылі асобную галіну, якая аб'ядноўвае ўсё, што называецца чалавекападобнымі і прыродападобнымі тэхналогіямі, — то-бок штучны інтэлект, растлумачыў эксперт.

— Чаму гэты кірунак у ліку прыярытэтаў? Таму што праекты, звязаныя з даследаваннямі і распрацоўкамі ў гэтай галіне, маюць, як паказвае практыка, найбольшы эканамічны эфект. Прыносяць эфект не толькі ў эканоміцы, але і ў розных сферах жыцця грамадства, чалавека і дзяржавы, — падкрэсліў Сяргей Шлычкоў.

Яшчэ адзін найважнейшы прыярытэт — усё, што звязана з прамысловасцю: тэхналогіі машынабудавання, прыборабудавання, мікра- і нанаэлектроніка, адзначыў эксперт.

— Хачу нагадаць, што ўжо некалькі гадоў запар апрацоўчая прамысловасць уваходзіць у топ нумар адзін па ўнёску ў ВУП нашай краіны, — сказаў ён. — Таму другім прыярытэтам з'яўляецца развіццё нашага прамысловага комплексу. Гэта не толькі сістэма Міністэрства прамысловасці, гэта ўся прамысловасць, якая існуе ў краіне, — рэзюмаваў старшыня ДКНТ.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

«Асабліва хачу падкрэсліць дату 80-годдзя Перамогі, для нас яна вельмі важная не толькі ў плане цяперашніх падзей. Мы з вамі як гісторыкі разумеем, што праз пэўны прамежак часу, на жаль, падзеі паўтараюцца. Але для нас вельмі важна, каб нашы дзеці і ўнукі памяталі гэту дату, і на гэтых вялікіх датах, падзеях мы выхоўваем новае пакаленне», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Што датычыцца практычнага боку візіту дэлегацыі расійскага рэгіёна, то кіраўнік дзяржавы заўважыў: тавараабарот Беларусі і Пензенскай вобласці прыстойны — за 2024 год ён склаў 152,1 мільёна долараў. «Нягледзячы на тое, што мы гігантамі не з'яўляемся ў гэтым працэсе, усё ж такі рост вельмі значны ў мінулым годзе — амаль 10 %. Гэта толькі тое, што мы змаглі ўлічыць. Мы арыентаваныя на прамысловую кааперацыю з Расіяй і з вашай вобласцю. І я вельмі рады, што наша прадпрыемства МАЗ і ваша ГРАЗ супрацоўнічаюць. Хачу вас запэўніць: усё, што мы абяцалі жыхарам Пензенскай вобласці, абавязкова выканаем», — адзначыў Прэзідэнт.

Па словах кіраўніка дзяржавы, добрыя перспектывы мае супрацоўніцтва ў сферы ліфтабудавання. Гэта звязана з тым, што ў Беларусі, у Расіі ды і на ўсёй постсавецкай прасторы цяпер ёсць патрэба ў замене старых ліфтаў на новыя, таму попыт на гэту прадукцыю вельмі вялікі. І, як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, трэба развіваць дадзены кірунак.

«Мы вельмі зацікаўлены ў пастаўках да вас пасажырскай тэхнікі. І будзем нарошчваць аб'ёмы, калі ў вас будзе неабходнасць. Гэта і тралейбусы, і трамваі, прытым на розных відах паліва — і газаматорнае паліва, і звычайным рухавікі ўнутранага згарання», — прапанаваў кіраўнік дзяржавы. Вельмі перспектыўным кірункам ён бачыць супрацоўніцтва ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. «Мы можам прадставіць увесь набор тэхнікі для таго, каб вы маглі эфектыўна працаваць у гэтай галіне. Я ўжо не кажу аб сельскай гаспадарцы, аб прадуктах харчавання. Нашы крамы, ведаю, працуюць у вас у Пензе, і не адна. Калі трэба пашыраць дадзены кірунак супрацоўніцтва — мы будзем гэта рабіць, — прапанаваў Аляксандр Лукашэнка. — Вы прыехалі да сваіх сяброў, вы прыехалі як да сябе дадому. І будзьце ўпэўнены, што ўсё, аб чым мы дамовімся, будзе выканана, і нават яшчэ больш эфектыўна і аператыўна, чым у самой Расіі. Вы ў гэтым можаце быць перакананы. Калі гэта не так, вы скажыце, мы выправім сітуацыю, магчымасці і рэзервы ў нас немалыя».

Па словах беларускага лідара, гэтыя рэзервы трэба рэалізоўваць у сілу той сітуацыі, якая назіраецца сёння. «Усё не так проста і не так дабрадушна, як камусьці здавалася б, — адзначыў беларускі лідар.

**— У чарговы раз варта сказаць, што ўсё будзе залежаць ад нас. Трэба арыентавацца толькі на свае магчымасці. Але калі нешта прыбудзе звонку, мы будзем толькі рады».**

Аднак, папярэдзіў Прэзідэнт, трэба з галавой падыходзіць да таго, што прапануюць: «Таму што мы ўжо наеліся гэтай беганіны: «Ах, там якасць, інвестыцыі і гэтак далей». Цяпер грошы скралі, арыштавалі і ў Расіі, і ў нас. Дзе тыя інвестары і дзе тая якасць, на якія мы маліліся? Урок атрымалі добры. Трэба арыентавацца на сваё. Мы здольныя шмат зрабіць». Па словах Аляксандра Лукашэнкі, патрэбны час і цярпенне, каб выйсці з той сітуацыі, якая склалася. Ён выказаў спадзяванне, што такую пазіцыю падзяляюць і ў Расіі. «Давайце разам супрацоўнічаць і рабіць адну справу, якая патрэбна для нашых народаў Беларусі і Расіі. Гэта вельмі важна напярэдадні свята 2 красавіка — Дня яднання», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

## СУМЕСНЫМІ НАМАГАННЯМІ ДАМОЎЛЕНАСЦІ ВЫКАНАНЫЯ

Алег Мельнічэнка адзначыў, што дэлегацыя Пензенскай вобласці прыехала з вельмі вялікай праграмай. Па яго словах, гэта першы раз, калі дэлегацыя прыязджае амаль на цэлы тыдзень. Губернатар расказаў, што сумеснымі намаганнямі былі выкананы дамоўленасці, дасягнутыя падчас папярэдняй сустрэчы. «Мы вельмі ўдзячныя за праект, які быў рэалізаваны ў рамках абнаўлення грамадскага транспарту Пензенскай вобласці. Тыя 94 тралейбусы, якія былі закуплены, зробленыя ў кааперацыі з Мінскім аўтамабільным заводам. Да мадэрнізацыі грамадскага транспарту ў нас было 54 тралейбусы, цяпер у нас 94 новыя, добра абсталяваныя тралейбусы. Мы гэту работу, безумоўна, будзем працягваць», — сказаў Алег Мельнічэнка.

У графіку візіту пензенскай дэлегацыі — сустрэча з кіраўніцтвам Мінскага аўтамабільнага завода, падчас якой плануецца падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве. Губернатар расказаў, што сёлета ў Пензенскай вобласці плануюць закупіць яшчэ 60 аўтобусаў. «І ў гэтым кірунку, я думаю, мы будзем паглыбляць сваё супрацоўніцтва», — перакананы ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

## «Гэта толькі пачатак слаўнага шляху»

Журналістам Алег Мельнічэнка расказаў, што Беларусь і Пензенская вобласць актыўна супрацоўнічаюць у сферы імпартазамяшчэння сельскагаспадарчай тэхнікі. Гэты расійскі рэгіён закупляе значныя аб'ёмы сельскагаспадарчай тэхнікі беларускай вытворчасці. Паколькі Пензенская вобласць з'яўляецца буйным вытворцам цукру, ёсць зацікаўленасць у тэхніцы, патрэбнай для збору сыравіны. «Плюс нашы машыны, якія завязаны на камунальнай гаспадарцы. Тэхніка, што выкарыстоўваецца ў дарожным будаўніцтве. У нас даволі добры аб'ём супрацоўніцтва з Беларуссю», — расказаў Алег Мельнічэнка. Ён звярнуў увагу, што Пензенская вобласць — найбуйнейшы ў Еўропе вытворца мяса індычкі. «Птушку трэба карміць, патрэбны камбікармы. У любых камбікармах ёсць лізін. А мы лізін не выпрабляем. У нас ёсць цікавы праект, у рамках якога мы можам праз закупкі беларускага лізіну забяспечыць вытворчасць сваіх якасных камбікармоў. Гэта таксама цікавы кірунак», — расказаў губернатар.

«З улікам таго, што за апошнія паўтара года мы на 30 % выраслі па сумесных нашых эканамічных сувязях — гэта добры рост. Я думаю, гэта толькі пачатак слаўнага шляху. І мы будзем ісці далей гэтым курсам», — падкрэсліў Алег Мельнічэнка. Тым больш, паводле яго слоў, у Пензенскай вобласці ёсць цікавыя прапановы да беларускіх калег. Напрыклад, у медыцыне. Пензенская вобласць займае 70 % рынку Расійскай Федэрацыі па вытворчасці клапанаў сэрца, інструментаў для малаінвазійных аперацый, матэрыялаў для хуткага загойвання хірургічных ран. «Усё гэта мы гатовы тут прадставіць. І гатовы ў дадзеным кірунку прадукцыйна супрацоўнічаць», — запэўніў ён.

Алег Мельнічэнка адзначыў, што Беларусь і Расія рэалізоўваюць шэраг цікавых праектаў у галіне культуры, патрыятычнага выхавання моладзі. Як прыклад — фільм «Загадана жыць», зняты сумеснымі намаганнямі беларускіх і пензенскіх кінематаграфістаў на тэрыторыі Беларусі і Пензенскай вобласці. Фільм прысвечаны ўраджэнцу Пензы Аляксею Пятровічу Чарткову — камандзіру 122-га партызанскага атрада, які дзейнічаў у гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі. Адметнасць фільма ў тым, што тут здымаліся не акцёры-прафесіяналы, а курсанты і студэнты. «Атрымалася вельмі прафесійна. Практычнае пасведчанне атрымана ў Расіі і ў Беларусі. Да 80-годдзя Перамогі важна яго тут паказаць. Фільм цікавы, захапляльны, ад душы народа», — расказаў Алег Мельнічэнка.

Дэлегацыя Пензенскай вобласці ў рамках свайго візіту будзе працаваць таксама ў Магілёўскай і Брэсцкай абласцях. «Стаяць задачы паглыбіць нашы эканамічныя сувязі, кааперацыю паміж нашымі прадпрыемствамі, пазнаёміць моладзь, абмяняцца культурным вопытам», — паведаміў Алег Мельнічэнка.

# «СЛАВЯНСКІ БАЗАР» ПРОЙДЗЕ 10 –13 ЛІПЕНЯ

### А для яго гасцей устаноўлены бязвіз

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 1 красавіка падпісаў распараджэнне аб правядзенні XXXIV Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». У 2025 годзе ён пройдзе ў перыяд з 10 да 13 ліпеня, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

З улікам існуючай практыкі дзяржаўнай падтрымкі мерапрыемства для яго арганізатараў і ўдзельнікаў прадугледжаны асобныя льготы і прэферэнцыі.

У прыватнасці, для гасцей фестывалю з 71 дзяржавы ў перыяд з 4 да 20 ліпеня 2025 года ўстаноўлены бязвізавы парадак уезду ў Беларусь, часовага знаходжання і выезду з краіны.

Пропускам для бязвізавага перасячэння дзяржаўнай граніцы для замежных грамадзян будзе арыгінальны або электронны білет на мерапрыемствы фестывалю, што праводзяцца ў Летнім амфітэатры або канцэртнай зале «Віцебск». Па адным арыгінальным або электронным білеце дапускаецца аднаразовы ўезд у Беларусь аднаго замежнага грамадзяніна не пазней за дату правядзення названага ў білеце мерапрыемства.

Распараджэннем кіраўніка дзяржавы таксама актуалізаваны склад арганізацыйнага камітэта па правядзенні XXXIV Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

**Глеб ЛАПІЦКІ, член Савета Рэспублікі, дырэктар Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», патлумачыў «Звяздзе»:**

— XXXIV Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» сёлета пройдзе з 10 да 13 ліпеня, аднак яго праграма пачнецца крыху раней. Ужо з 8 ліпеня на многіх пляцоўках горада на Дзвіне стартуюць фестывальныя мерапрыемствы. Акрамя традыцыйных пляцовак — Летняга амфітэатра, канцэртнай залы «Віцебск» і іншых — сёлета мы абавязкова парадуем нашага гледача новай, якая стане прыемным дапаўненнем да шасцітысячнай залы амфітэатра.

Жыхароў і гасцей паўночнага рэгіёна чакаюць вялікая колькасць сцэнічных пляцовак, жанраў мастацтва, і, вядома, любімая праграма фестывалю: гэта і «Тэатральныя сустрэчы», і філарманічная праграма, і «Ялечны квартал». Мы таксама запусцім новы адукацыйны праект для моладзі «Тэрыторыя старту», які будзе праходзіць на базе



ўстаноў адукацыі нашага горада і дапаможа маладым музыкантам праявіць сябе.

**Добрай традыцыяй форуму мастацтва стала магчымасць наведаць яго без візы. 2025 год не стане выключэннем для гасцей і ўдзельнікаў фестывалю. Каб скарыстацца такой магчымасцю, трэба мець арыгінальны або электронны білет на мерапрыемствы ў Летнім амфітэатры або канцэртнай зале «Віцебск», адзін білет гарантуе аднаразовы ўезд не пазней за дату правядзення мерапрыемства, якая пазначана на білеце.**

На гэтым тыдні будзе апублікавана ўся праграма фестывалю, у першыя дні ўжо стануць вядомымі мерапрыемствы на пляцоўцы амфітэатра і канцэртнай залы, пасля мы раскрыем галоўную інтрыгу — нарэшце раскажам пра новую пляцоўку. Абяцаем да пятніцы праінфармаваць нашага гледача аб усіх праектах і канцэртах, каб зноў сустрэцца ў фестывальным Віцебску ўжо зусім хутка.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

БЯСПЕКА

# НА ПРЫНЦЫПАХ АДКАЗНАСЦІ, ДОБРАСУСЕДСТВА І МІРНАГА СУІСНАВАННЯ

**Акцэнты XVIII міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Забеспячэнне нацыянальнай, рэгіянальнай і міжнароднай бяспекі: актуальныя праблемы і рашэнні»**

Мерапрыемства, прысвечанае 85-годдзю ўтварэння Акадэміі нацыянальнай бяспекі Беларусі, адбылося ў Нацыянальнай акадэміі навук. Эксперты і спецыялісты абмеркавалі шырокі спектр актуальных пытанняў, падзяліліся вопытам і падыходамі, якія датычацца розных сфер гарантавання бяспекі.




Фота БелТА.

## «МЫ ЯК НІКОЛІ ЎСВЕДАМЛЯЕМ ЗНАЧЭННЕ КАШТОЎНАСЦІ МІРУ»

Віншуючы калектыў Акадэміі нацыянальнай бяспекі з 85-годдзем з дня заснавання, **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** адзначыла, што ўсе гэтыя гады акадэмія служыць крыніцай унікальных ведаў, выхоўвае прафесіяналаў, адданых ганаровай справе забеспячэння бяспекі і аховы нашай Радзімы. Кажучы пра актуальнасць выбранай тэматыкі канферэнцыі, спікер заўважыла, што ва ўмовах, калі свет хутка змяняецца, калі пагрозы становяцца ўсё больш разнастайнымі і выдасканаленымі, неабходна аналізаваць праблемы, якія існуюць, і выпрацоўваць канкрэтныя механізмы, здольныя даць папераджальны адказ на выклікі часу.

Наталля Качанава нагадала, што сёлета мы адзначаем 80-годдзе Вялікай Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. «Мы памятаем урокі гісторыі і як ніколі ўсведамляем значэнне каштоўнасці міру, — канстатавала яна. — Яшчэ нядаўна мы з цяжкасцю маглі ўявіць, што зноў апынёмся на мяжы глабальнага канфлікту, у якім не будзе пераможцаў і пераможаных. Звышдзяржавы ўключыліся ў бескампрамісную барацьбу за геапалітычны ўплыў, а свет знаходзіцца ў стадыі фарміравання шматпалярнага светаўладкавання. Краіны калектыўнага Захаду адкрыта працягваюць спансіраваць дзяржаўныя перавароты, выкарыстоўваючы адпрацаваныя механізмы «каляровых рэвалюцый». Растуць выдаткі на мілітарызацыю, вакол нашых граніц нарошчваецца прысутнасць натаўскіх войскаў. Вядзецца барацьба не толькі за тэрыторыі, але і за розумы людзей. Усё гэта не можа нас не турбаваць».

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на тое, што ў сучасным свеце інфармацыя стала магутнай зброяй. «Фэйкавыя навіны здольныя падрываць давер да дзяржаўных інстытутаў улады, правакаваць сацыяльныя і этнічныя канфлікты, ствараць хаос у грамадстве, — канкрэтызавала спікер. — Усе мы памятаем жнівень 2020 года, калі наша краіна стала аб'ектам дэструктыўнага ўмяшання. Мы выстаялі тады. Дзякуючы нашаму Прэзідэнту, яго асабістай палітычнай сіле. Мільёны беларусаў не аказаліся зноў уцягнутымі ў ваенны канфлікт».

І цяпер наша краіна, па словах Наталлі Качанавай, працягвае сутыкацца з шэрагам сур'ёзных выклікаў, якія патрабуюць кансалідацыі намаганняў, стратэгічнага падыходу і інавацыйных рашэнняў. Спікер лічыць, што сёння неабходна распрацоўваць сумесныя даследчыя праекты, праграмы, накіраваныя на эфектыўную барацьбу з тэрарызмам і кіберпагрозамі.

«На VII Усебеларускім народным сходзе была зацверджана Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі, якой дадзены дакладны адказ на геапалітычныя змены ў свеце, новыя віды і характар пагроз, — нагадала Старшыня Савета Рэспублікі. — Міралюбівая палітыка нашай дзяржавы ў канцэпцыі праходзіць чырвонай ніткай. Мы прама і адкрыта заявілі глабальнаму свету аб сваіх прыярытэтах у сферы забеспячэння нацыянальнай бяспекі, аб адкрытасці нашай палітыкі, аб Беларусі як адказным, надзейным партнёры. Упершыню ў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі з'явіўся тэрмін «электаральны суверэнітэт». У 2025 годзе падчас правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь мы пераканаўча прадэманстравалі ўсяму свету прыклад рэалізацыі поўнаўладдзя народа і свабоды яго выбару».

Спікер засяродзіла ўвагу ўдзельнікаў канферэнцыі на тым, што Беларусь паслядоўна пацвярджае статус міралюбівай дзяржавы, нягледзячы на недружалюбныя выпады асобных палітыкаў і нават цэлых краін. «Нашы прынцыпы заснаваныя на ўзаемнай падтрымцы ў барацьбе з сучаснымі выклікамі, адказнасці, добрасуседстве і мірным суіснаванні, — адзначыла Наталля Качанава. — Як падкрэсліў паважаны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка на ўрачыстай цырымоніі інаўгурацыі: «На шчасце, у нас шмат сяброў і саюзнікаў. Брацкая Расія, Вялікі Кітай, партнёры Садружнасці Незалежных Дзяржаў, ШАС, БРІКС. Фактычна ўсе краіны, якія сёння ўтвараюць глабальную большасць». Мы гатовы дзяліцца вопытам і супрацоўнічаць

# НАШЧАДКІ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вітаючы маладых людзей, **старшыня ФПБ Юрый СЯНЬКО** нагадаў, што Вялікая Айчынная вайна пакінула і шмат пераможных нашых суайчыннікаў, і, на жаль, шмат сумных падзей для Беларусі і Расіі. Народы нашых краін маюць агульныя карані, агульную гісторыю, агульнае разуменне, што сёння неабходна адстойваць і абараняць.

— Падчас Вялікай Айчыннай вайны Беларусь першая з усіх саюзных рэспублік прыняла на сябе ўдар фашыстаў, перажыла найцяжэйшыя 1133 дні акупацыі. Наша краіна была амаль цалкам разбурана. Жанчын, дзяцей, старых сотнямі тысяч забівалі, зажыва спальвалі проста за тое, што яны жылі на сваёй роднай зямлі. Перажыўшы ўсё гэта, наш народ на генетычным узроўні засвоіў: нацызм — гэта абсалютнае зло. Менавіта таму ў нашай краіне на дзяржаўным узроўні забяспечваецца абарона гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне. Больш за тое, гэта норма ўнесена ў Канстытуцыю нашай краіны, прыняты законы аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму і генацыдзе беларускага народа, — адзначыў Юрый Сянько.

Ён дадаў, што падзеі, якія сёння адбываюцца ў свеце, пацвярджаюць: гісторыя сапраўды цыклічная.

— На жаль, мы бачым, што ў шэрагу краін ізноў пачынаюць распаўсюджвацца і нават падтрымлівацца ідэі нацызму. Бачым, як наўмысна скажаецца праўда пра Вялікую Айчынную вайну, як катаў спрабуюць зрабіць героямі, а праўду пра сапраўдных герояў пахаваць разам са сведкамі тых страшных падзей. Хоць 80 гадоў таму не толькі Савецкі Саюз, але і ўвесь свет быў упэўнены, што перамагаў зло. На Нюрнбергскім працэсе даказана: менавіта гітлераўская Германія развязала Другую сусветную вайну, былі асуджаны галоўныя нацысцкія злачынцы, прызнаны злачыннымі шэраг арганізацый і тыя, хто ў іх служыў. А самае галоўнае — злачыннай была прызнана сама ідэалогія нацызму, — падкрэсліў Юрый Сянько, дадаўшы, што сёння заходні свет робіць усё, каб перапісаць гэту задакументаваную і пацверджаную фактамі гісторыю.

Ён звярнуў увагу, што ў заходніх краінах знішчаюцца помнікі воінам-вызваліцелям, падтрымліваюцца неанацысцкія фарміраванні, ушаноўваюцца людзі, якія асабіста вінаватыя ў масавых забойствах, і ў цэлым праводзіцца палітыка, калі заходнія краіны зноў спрабуюць падпарадкаваць сабе іншыя дзяржавы.

— Менавіта з гэтай мэтай развязваюцца войны, арганізоўваюцца «каляровыя рэвалюцыі», уводзяцца санкцыі. І наўрад ці тыя, хто праводзіць такую палітыку, адмовяцца ад гэтых ідэй. Тыя ж краіны Заходняй Еўропы стагоддзямі жылі за кошт падпарадкавання іншых дзяржаў. І цяпер, няхай і іншымі метадамі, імкнуцца да таго ж, — удакладніў старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, дадаўшы, што сёння не ўсе маладыя людзі ведаюць праўду пра тую трагедыю, якую перажылі нашы народы падчас Вялікай Айчыннай вайны. Улічваючы гэта, рабоце па захаванні гістарычнай памяці ў апошнія гады ў нашай краіне ўдзяляецца вялікая ўвага.

У важнасці захавання гістарычнай памяці перакананая і **ўдзельніца форуму з Масквы Аляксандра МАЗУР.**

— Галоўнае — мы павінны перадаваць нашым дзецям і ўнукам тыя цяжкія эмоцыі, каб яны разумелі: не проста так дадзена мірнае жыццё на Зямлі, трэба шанаваць і паважаць гісторыю. 2 красавіка — Дзень яднання нашых брацкіх народаў, якія змаглі плячо ў плячо зрабіць каласальны ўнёсак у Вялікую Перамогу, за якую мы, новыя пакаленні, ім вельмі ўдзячныя. Калі гартаеш падручнікі па гісторыі, ты проста чытаеш літары. А тут хлопцы і дзяўчаты на свае вочы адчуюць дух патрыятызму і гонару — за прадстаўленне свайго горада-героя, сваіх гераічных продкаў, родных і блізкіх. Менавіта па такую атмасферу сюды прыехала я. І мая мара — убачыць Брэсцкую крэпасць — неўзабаве здзейсніцца.

**Сяргей ШАБАШОЎ, дэлегат з Керчы**, у нашай краіне ўпершыню і таксама мае вялікае жаданне больш даведацца пра гістарычныя месцы.

— Я паглядзеў фільм пра Брэсцкую крэпасць. У нас плануецца туды экскурсія, якую я з хваляваннем чакаю. Ведаю, што Мінск з'яўляецца горадам-героем, а Брэсцкая крэпасць — адзіная крэпасць, якая атрымала званне крэпасці-героя. Вельмі рады, што ўдасца пабываць у іх.

Форум завершыцца 4 красавіка. Кожнай дэлегацыі гарадоў-герояў будзе ўручаны сімвалічны знак са жменькай зямлі з усіх гарадоў-герояў Беларусі і Расіі. Завяршальным акордам стане пасадка Алеі Памяці гарадоў-герояў у сталічным Парку Перамогі.

**Алена КРАВЕЦ.**

з усімі дзяржавамі, настроенымі на паважлівы дыялог».

### «ПРАСОЎВАННЕ МІРАЛЮБІВАГА СТВАРАЛЬНАГА ПАРАДКУ ДНЯ — ПЕРШАРАДНАЯ ЗАДАЧА МІЖПАРЛАМЕНЦКАЙ ДЫПЛАМАТЫІ»

Як звярнуў увагу **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА**, за гэтыя гады ў Акадэміі нацыянальнай бяспекі падрыхтавана цэлая плеяда кіраўнікоў і супрацоўнікаў у сферы забеспячэння нацыянальнай бяспекі не толькі для Беларусі, але і для дзяржаў — удзельніц СНД. «У акадэміі сфарміраваны свае традыцыі, на якіх выхоўваюцца сапраўдныя прафесіяналы, адданыя сваёй справе, — адзначыў ён. — Мы разумеем, што кваліфікаваныя кадры — гэта аснова, падмурак сістэмы забеспячэння бяспекі любой дзяржавы».

Па словах спікера, сёння выразна відаць, што архітэктура міжнароднай бяспекі, якая дазваляла захоўваць крохкі баланс на еўрапейскім кантыненце, фактычна цалкам разбурана. «Радыкальна змяніўся характар пагроз на нашых заходніх граніцах: краіны НАТА нарошчваюць канцэнтравань войскі і праводзяць маштабныя манеўры, — канкрэтызаваў ён. — З беспрэцэдэнтным размахам і выкарыстаннем самых выдасканаленых форм вядзецца інфармацыйная вайна. Пастаянна нарошчваюцца рычагі эканамічнага ўздзеяння. Глыбокі крызіс сістэмы міжнароднай бяспекі садзейнічае актывізацыі тэрарыстычных і экстрэмісцкіх арганізацый, пашырэнню іх уплыву на новых тэрыторыях сусветнай прасторы».

Ігар Сергяенка канстатаваў, што ў сувязі з імклівым змяненнем свету, фарміраваннем новых выклікаў і пагроз варта не толькі рэагаваць, але і дзейнічаць на апярэджанне. «І, як сказаў кіраўнік дзяржавы на цырымоніі прынясення клятвы ваеннаслужачымі 25 сакавіка, галоўнымі прыярытэтамі нашай дзейнасці былі, застаюцца і застануцца нацыянальныя інтарэсы, бяспека краіны і людзей, — нагадаў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — У Беларусі створана ўстойлівая сістэма забеспячэння нацыянальнай бяспекі. Яна пастаянна ўдасканальваецца, аптымізуецца з улікам абстаноўкі, якая складваецца як унутры краіны, так і на знешнім контуры. Пацвярджэнне таму — прынятае ў мінулым годзе абноўленых дакументаў стратэгічнага планавання: Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі і Ваеннай дактрыны, якімі, адзначыў Прэзідэнт нашай краіны, закладзены прававы падмурак бяспекі Беларусі».

У гэтым жа ключы, па словах спікера, вытрыманы і заканадаўчыя ініцыятывы сілавых структур, якія накіраваны на супрацьдзеянне як актуальным пагрозам, так і тым, што прагназуюцца. Размова ідзе аб змяненні законаў па пытанні абароны суверэнітэту і канстытуцыйнага ладу, забеспячэння нацыянальнай бяспекі, барацьбы з тэрарызмам, кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці і шэрагу іншых.

«Прасоўванне міралюбівага стваральнага парадку дня — гэта таксама першарадная задача міжпарламенцкай дыпламатыі, — дадаў Ігар Сергяенка. — На ўсіх узроўнях міжнароднага дыялогу мы імкнёмся падтрымліваць аб'яднальныя ініцыятывы, накіраваныя на ўмацаванне даверу паміж нашымі краінамі. Аднак жыццё не стаіць на месцы, і ва ўмовах пастаяннага прагрэсу фарміруюцца новыя пагрозы як для асобна ўзятай краіны, так і для цэлых рэгіёнаў. Адэкватна на іх рэагаваць мы зможам толькі на аснове скаардынаваных і комплексных мер, якія рэалізоўваюцца як на нацыянальным, так і на міждзяржаўным узроўні».

### «СІСТЭМА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ ВЫКОНВАЕ СВАЮ РОЛЮ»

Як адзначыў у размове з журналістамі **дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ**, нягледзячы на рызыкі і выклікі, структуры, якія ўваходзяць у сістэму забеспячэння нацыянальнай бяспекі, выконваюць задачы, што на іх ускладзены. «Калі на тэрыторыі нашай краіны сёння мір і бяспека, калі мы на нашы вуліцы можам выпускаць дзяцей спакойна гуляць, сістэма нацыянальнай бяспекі выконвае сваю ролю», — канкрэтызаваў ён.

Аляксандр Вальфовіч падкрэсліў, што пытанні, звязаныя з забеспячэннем нацыянальнай бяспекі, знаходзяцца ў аснове. «Змяняецца геапалітычная абстаноўка, тэндэнцыі, на жаль, развіваюцца ў негатыўным рэчышчы, і ўсё гэта прыводзіць да глабальных негатыўных наступстваў, — сказаў ён. — Таму ўсё, што звязана з пытаннямі нацыянальнай бяспекі, вельмі важнае і хвалюе перш за ўсё і насельніцтва краіны, і людзей, якія гэтымі пытаннямі займаюцца».

Вялікая ўвага ўдзяляецца пытанням кібербяспекі: адпаведныя рызыкі і выклікі, па словах дзяржсакратара Савета бяспекі, маюць негатыўную, небяспечную тэндэнцыю. Гэтым пытанням падчас канферэнцыі была ўдзелена асаблівая ўвага.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ШЧЫРЫЯ СЛОВЫ СПАЧУВАННЯ




1 красавіка ў генеральным консульстве Рэспублікі Саюз М'янма ў Мінску Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка, прадстаўнікі дзяржорганаў і грамадскасці, прадстаўнікі дыпмісій замежных дзяржаў у Беларусі пакінулі запіс у кнізе спачуванняў у сувязі са шматлікімі чалавечымі ахвярамі ў выніку разбуральнага землетрасення ў М'янме.

**Фота БелТА.**

НА КАНТРОЛІ

# У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — ЭКАНАМІЧНЫ ЭФЕКТ

## З удзелам Наталлі КАЧАНАВАЙ абмеркавалі магчымасць стварэння ў Мінску тэхнапарка лёгкай прамысловасці

Мяркуецца, што тэхнапарк, які аб'ядноае і буйныя, і невялікія вытворчасці, з'явіцца на базе ААТ «Прамень» — кіруючая кампанія холдынга «Абутак — «Прамень». Менавіта тут і прайшла рабочая сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі, упаўнаважанага прадстаўніка Прэзідэнта па горадзе Мінску з кіраўніцтвам горада, «Беллегпрама», фабрыкі.

Найперш у музеі прадпрыемства спікер азнаёмілася з больш як стагадовай яго гісторыяй, пасля чаго — з асартыментам сучаснай прадукцыі. Дарэчы, для вырабу адной пары абутку патрабуецца правядзенне ад 120 да 150 тэхналагічных аперацый.

Пачынаючы рабочую сустрэчу, Наталля Качанава адзначыла, што разам са старшынёй Мінгарвыканкама Уладзімірам Кухаравым даўно планавалі наведаць гэта прадпрыемства. «З мэтай выканання даручэнняў Прэзідэнта нашай краіны, якія былі дадзены падчас наведвання «МотаВелаЗавода», па стварэнні тэхнапаркаў у горадзе Мінску, — удакладніла спікер. — Прадпрыемствы, якія створаны на «Мотавела», працуюць ныдрэнна».

Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, на тэрыторыі прадпрыемства «Прамень» ёсць шэраг будынкаў, якія можна ўцягнуць у гаспадарчы абарот. Пры гэтым яна ўдакладніла, што не ўсе плошчы задзейнічаны пад патрэбы абутковай фабрыкі. Калі будзе створаны тэхнапарк, іх змогуць выкарыстоўваць іншыя вытворцы.

«Калі б мы стварылі тут тэхнапарк, для прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці, было б нядрэнна, — адзначыла Наталля Качанава. — У нас ёсць «Камволь», прадпрыемствы «Алеся», «Элема» і іншыя. У нас шмат людзей, якія наладзілі б тут невялікія пашывачныя вытворчасці. І калі б гэта ўсё было сканцэнтравана ў адным месцы, было б нядрэнна. Тым больш, калі ствараецца тэхнапарк, ёсць пэўныя прэферэнцыі».

Спікер звярнула ўвагу на непрэзентабельны выгляд будынкаў прадпрыемства. «Зразумела, калі ствараць тэхнапарк, гэта павінны быць добрыя карпусы з добрымі фасадамі», — заўважыла Наталля Качанава, удакладніўшы, што ў цэнтры горада такіх будынкаў быць не павінна.

**Вераніка КАНЮТА.**

# «НОВЫ ЭТАП РАЗВІЦЦЯ»

## Кіраўнікі Міншчыны і Гродзеншчыны прадстаўлены сваім абласным актывам

У аўторак на пасяджэннях пазачарговых сесій Мінскага абласнога Савета дэпутатаў і Гродзенскага аблсавета зацвердзілі на пасады новых кіраўнікоў рэгіёнаў — старшыню Мінскага аблвыканкама Аляксея Кушнарэнку і старшыню Гродзенскага аблвыканкама Юрыя Караева.

Дэпутаты Мінскага аблсавета аднагалосна падтрымалі асобу новага губернатара, афіцыйна замацаваўшы прызначэнне Аляксея Кушнарэнкі на пасаду кіраўніка рэгіёна.

«Ад работы Мінскай вобласці, як заўсёды адзначаў кіраўнік дзяржавы, залежыць работа нашай краіны ў цэлым, — сказаў **прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН**, прадстаўляючы новага кіраўніка Мінаблвыканкама. — Я ўпэўнены, што Аляксей Іванавіч падтрымае дынаміку, якая ёсць у вобласці, надасць ёй імпульс, паскарэнне, паглядзіць на некаторыя рэчы новым свежым поглядам. Перакананы, што пад яго кіраўніцтвам вобласць будзе развівацца ў патрэбным кірунку. Безумоўна, з вамі — з камандай, якая ёсць у Мінскай вобласці, гэта будзе рабіць працэй».

Паводле слоў кіраўніка ўрада, усё ў жыцці ідзе наперад, мяняецца: «І гэта новы этап развіцця. Ну, а ўрад, вядома, не будзе забываць пра Мінскую вобласць, будзе ўсяляк дапамагаць. Я ўпэўнены, што разам у нас усё атрымаецца».

**Старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксей КУШНАРЭНКА** запэўніў прысутных, што прыкладзе ўсе намаганні для таго, каб працягнуць тыя слаўныя традыцыі, якія ёсць, і што ён настроены на сумесную плённую работу».

На пазачарговай сесіі Гродзенскага аблсавета Юрый Караеў быў зацверджаны на пасаду старшыні Гродзенскага аблвыканкама.

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый КРУТОЙ** паставіў перад Юрыем Караевым шэраг важных задач, сярод якіх «бясшвовы» пераход у рабоце фінансавага блока. Ён растлумачыў, што мае на ўвазе: напэўна са зменай кіраўніка ў рэгіёне актывуюцца дзясяткі дзялкоў з рознымі прапановамі пад выкарыстанне дзяржаўных інвестыцый, якія раней папярэднім старшынёй былі адкінуты як неэфектыўныя. На думку Дзмітрыя Крутога, сёння важна не дапусціць дысбалансу ў бюджэтнай сферы. Наступны блок — гэта інвестыцыйныя праекты і, у прыватнасці, рэалізацыя праграмы «Адзін раён — адзін праект»: «Цяпер дарučана перагледзець усе рэгіянальныя праграмы, якія існуюць у краіне, з тым, каб не распыляць намаганні. Ёсць неабходнасць комплексна перагледзець гэты кірунак. Моцныя рэгіёны — моцная краіна. І падпісаны ўказ аб перадачы паўнамоцтваў на месцах на раённым узроўні, бо гэта, вядома, запатрабуе асаблівай увагі да стымулявання інвестыцыйнай актыўнасці ў раёнах. Мы разлічваем на тое, што ключавыя праекты, якія рэалізуюцца або будуць рэалізоўвацца ў вобласці, будуць знаходзіцца пад асабістым кантролем Юрыя Хаджымуратавіча».

Акрамя гэтага, Дзмітрый Крутой распарадзіўся асаблівую ўвагу ўдзяляць захаванню людзей у рэгіёне, у прыватнасці стварэнню спрыяльных умоў для маладых спецыялістаў. Таксама ён акцэнтаваў увагу на падтрыманні лідарскіх пазіцый рэгіёна ў сферах нарошчвання валавога рэгіянальнага прадукту, развіцця прамысловасці, імпартазамяшчэння, сельскай гаспадаркі і добраўпарадкавання. Асабліва падкрэсліў неабходнасць развіцця турыстычнага патэнцыялу.

**Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Юрый КАРАЕЎ** абазначыў ключавыя кірункі работы на найбліжэйшую перспектыву. Сярод прыярытэтных задач — развіццё эканомікі, падтрымка аграпрамысловага комплексу, умацаванне інвестыцыйнай прывабнасці вобласці, а таксама мадэрнізацыя сацыяльнай інфраструктуры. Асаблівая ўвага будзе аддадзена пытанням дэмаграфіі, аховы здароўя і адукацыі.

**Даніл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# СТАЛІ ЧАСЦЕЙ ВЫБІРАЦЬ «ЭЛЕКТРЫЧКІ»

## Пра гэта сведчыць статыстыка продажаў электракараў у нашай краіне

На дарогах Беларусі ўсё часцей і часцей сустракаюцца машыны не з рухавіком унутранага згарання, а экалагічна чыстыя электрамабілі, якія заваёўваюць давер мясцовых аўтааматараў. Паводле звестак Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі, толькі ў студзені 2025-га на рынку новых аўтамабіляў была зафіксавана рэкордная доля «зялёных аўто», сумарныя продажы якіх у гэтым месяцы дасягнулі 586 штук, што склала 14,2 % ад продажаў у сегменце легкавых аўтамабіляў.



— У першым месяцы 2025 года адбыўся больш чым двухразовы рост продажаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, — адзначае **намеснік старшыні праўлення БАА, дырэктар ТАА «Лозанж» Андрэй ТКАЧОЎ.** — На дынаміку рынку аказала станоўчы ўплыў як з'яўленне новых мадэляў, так і наяўнасць розных крэдытных і лізінгавых праграм пры набыцці новага аўтамабіля.

На думку эксперта, у 2025 годзе будзе праходзіць трансфармацыя рынку, якая ўжо прасочвалася летась і стала відавочная па выніках студзеня гэтага года. Усё больш і больш беларускіх спажыўцоў аддаюць перавагу гібрыдам і электрамабілям.

Даныя за люты пацвердзілі тэндэнцыю: доля «зялёных аўтамабіляў» працягнула рост у дылерскіх продажах.

**Старшыня праўлення БАА, кіраўнік ТАА «Аўтацэнтр на МКАД» Сяргей ВАРЫВОДА** агучыў наступныя даныя.

— У лютым 2025 года 12,6 % сукупных продажаў забяспечылі электрамабілі, уключаючы паслядоўныя гібрыды.

На думку спецыялістаў, з улікам захавання з боку дзяржавы падтрымкі развіцця электратранспарту ў нашай краіне можна прагназаваць да канца года істотны рост электрапарку ў Беларусі. Гэтаму, безумоўна, спрыяюць дзяржпадтрымка (пры ўвозе электракараў дылеры вызвалены ад выплаты мытных пошлін і ПДВ) і пашырэнне сеткі электразарадных станцый.

# ТРЭНД НА РОСТ

## Работадаўцы Беларусі прапаноўваюць больш вакансій і павышаюць заробкі




Гэта вынікае з макраагляду Еўразійскага банка развіцця, аналітыкі якога канстатуюць, што ў лютым 2025 года колькасць занятых вырасла (+0,1 % у гадавым вылічэнні) упершыню за апошнія 10 гадоў.

Пры гэтым высокі попыт на працоўную сілу захоўваецца: колькасць вакансій таксама расце, што падтрымлівае павышэнне аплаты працы.

— У рэальным выражэнні заработная плата павялічылася на 11,1 % у лютым (калі параўноўваць з лютым 2024-га) пасля 13,5 % у студзені. У бюджэтным сектары заробкі выраслі на 12 %.

Аналітыкі ЕАБР чакаюць далейшага росту заробкаў у Беларусі:

— Гэтаму будзе спрыяць высокая канкурэнцыя за кадры і запланаванае ў бюджэце павышэнне аплаты працы ў дзяржаўным сектары.

# СМАЧНА, КАРЫСНА, ЯКАСНА

## Мінэканомікі: распрацоўка галіновых стратэгій накіравана на ўмацаванне харчовай бяспекі і развіццё ўласнай сыравіннай базы

Аб гэтым міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР гаварыў на сумесным пасяджэнні калегіі Мінэканомікі і Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях.

Як паведамілі ў прэс-службе Мінэканомікі, у ходзе мерапрыемства з удзелам прадстаўнікоў Мінсельгасхарча і Белдзяржхарчпрама абмяркоўваліся праекты стратэгіі развіцця сельскай гаспадаркі, рыбагаспадарчай дзейнасці і вытворчасці прадуктаў харчавання да 2035 года і стратэгіі развіцця кандытарскай і алейна-тлушчавай галін Рэспублікі Беларусь на 2026—2035 гады.

Міністр эканомікі адзначыў, што паспяховая будучыня сельскай гаспадаркі і сумежных сектараў звязана з павелічэннем вытворчасці, прамкааперацый, умацаваннем пазіцый на ўнутраным рынку і пашырэннем геаграфіі паставак нашай прадукцыі.

— Наша найважнейшае дасягненне і прадмет асаблівага гонару — харчовая бяспека. Беларусь дасягнула найбольш высокага ўзроўню самазабеспячэння харчаваннем у ЕАЭС — 96 %. А па асноўных групах прадуктаў забяспечваем сябе з вялікім запасам. І гэты трэнд неабходна захаваць у далейшым.

Юрый Чабатар адзначыў, што яшчэ адзін стратэгічны кірунак — паглыбленая перапрацоўка сельгаспрадукцыі, пашырэнне асартыменту.

— Доля такіх праектаў, заснаваных у тым ліку на ідэях комплекснага прагнозу навукова-тэхнічнага прагрэсу ў інвестыцыйным партфелі стратэгій павінна расці, — падкрэсліў ён.

Міністр эканомікі таксама акцэнтаваў увагу на ролі аўтаматызацыі, дакладнага земляробства і лічбавізацыі. Іх шырокае прымяненне, нараўне з рацыянальным і эфектыўным прагназаваннем і планаваннем, будзе спрыяць якаснаму развіццю галіны.

# ДОБРЫ ВЫНІК

## Колькасць аб'ектаў незавершанага будаўніцтва ў Беларусі за чатыры гады знізілася на 76,3 %



Выкананне галіновых мерапрыемстваў па скарачэнні колькасці аб'ектаў звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва разгледзелі на калегіі Мінбудархітэктуры пад кіраўніцтвам міністра архітэктуры і будаўніцтва Аляксандра Студнева, паведамілі ў профільным міністэрстве.

Начальнік галоўнага ўпраўлення будаўніцтва і жыллёвай палітыкі Тацццяна Васілючак адзначыла, што ў цэлым па краіне агульная колькасць аб'ектаў звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва за 2021—2024 гады скарацілася з 4465 аб'ектаў да 1059, або на 76,3 %. Непасрэдна за мінулы год іх стала менш на 59, або 5,3%.

У галіновыя мерапрыемствы Мінбудархітэктуры ў пачатку 2021 года было ўключана 52 аб'екты звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва, на 1 студзеня 2024-га — 13 аб'ектаў. У ходзе праведзенай у мінулым годзе работы на 1 студзеня 2025 года ўсе аб'екты ўцягнуты ў гаспадарчы абарот. Рэалізацыя галіновых мерапрыемстваў працягваецца.

Як падкрэсліў профільны міністр, рэалізацыя комплексу мер па скарачэнні аб'ектаў звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва і недапушчэнні ўтварэння новых такіх аб'ектаў на 2021—2025 гады павінна быць завершана ў бягучым годзе.

# «НАДВОР'Е ДАЗВАЛЯЕ ПРАЦАВАЦЬ»

## Ход лесааднаўлення ветравальна-бураломных участкаў разгледзелі ў Мінлясгасе

Днямі ў Мінлясгасе прайшла нарада, цэнтральнай тэмай якой сталі буралмы і лесааднаўленне пашкоджаных участкаў.

Як паведаміў **міністр лясной гаспадаркі Аляксандр КУЛІК,** аднаўлена ўжо больш за 2,6 тысячы гектараў бураломных участкаў з 6,8 тысячы гектараў запланаваных на гэты год.

— Надвор'е пакуль дазваляе працаваць. Ідзе пахаладанне, дажджы. Для нас гэта добрае надвор'е, — канстатаваў міністр.

Асобна ён акцэнтаваў увагу на неабходнасці паскарэння тэмпаў пасеву лесу. Генеральнаму дырэктару Гомельскага ДВЛГА даручана арганізаваць адпаведную работу.

# АКЦЭНТ НА ДАСТУПНАСЦЬ

## Гандлёвыя сеткі прадоўжылі скідку ў 10 % на шэраг тавараў для ўразлівых катэгорый насельніцтва

Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю і буйныя гандлёвыя сеткі краіны падпісалі пагадненне аб прадаўжэнні прадастаўлення сацыяльных скідак для ўразлівых катэгорый насельніцтва. Пра гэта паведамілі БелТА ў прэс-службе МАРГ.



Пагадненне было заключана ў студзені 2022 года, затым неаднаразова прадаўжалася. У сувязі з тым што тэрмін дзеяння зноў падыходзіў да заканчэння, было прынята рашэнне падпісаць чарговае дадатковае пагадненне — на другі квартал 2025 года.

Скідка ў 10 % даецца пенсіянерам, інвалідам, шматдзетным сем'ям і малазабяспечаным слаям насельніцтва. У ліку тавараў, на якія яна распаўсюджваецца, — хлеб, мука, аўсяныя шматкі, ячныя крупы, сухія макаронныя вырабы, ялавічына, свініна, тушка курэй (уключаючы бройлераў), малако, кефір, смятана, тварог, яйкі, яблыкі, агародніна і іншыя тавары.

Усе ўмовы і ўдзельнікі пагаднення засталіся ранейшымі.

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
2 красавіка 2025 г. № 12 (793)



# БУДЗЕМ СЯБРАВАЦЬ РЭГІЁНАМІ!

## Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва — адзін з найбольш эфектыўных фактараў беларуска-расійскай інтэграцыі




Супрацоўніцтва і сувязі паміж рэгіянальнымі суб'ектамі Саюзнай дзяржавы — тое, што дапамагае дзвюм краінам паспяхова пераадольваць усе выклікі апошняга часу. Аб гэтым неаднойчы гаварыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. «Самая вялікая каштоўнасць — найтанчэйшыя капіляры чалавечых адносін, агульная гісторыя, культура, менталітэт, традыцыйны погляд на сям'ю, шанаванне старэйшых, вялізныя перспектывы і падтрымка моладзі. Таму нават у самыя цяжкія для Беларусі і Расіі часы кантакты на ўзроўні рэгіёнаў актыўна развіваліся. Гэта дапамагло нам выстаяць ва ўмовах развалу дзяржаўнасці і разрыву ўстойлівых эканамічных сувязяў пасля распаду вялікай краіны», — сказаў беларускі лідар у відэазвароце да ўдзельнікаў X Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які адбыўся ва Уфе ў 2023 годзе. Сяброўства і супрацоўніцтва рэгіёнаў нашых краін актыўна развіваецца. Штогод падчас Форуму рэгіёнаў (сёлета ён будзе праходзіць у Ніжнім Ноўгарадзе, летась яго прымала Віцебшчына) заключаюцца мільённыя кантракты, наладжваюцца ўзаемавыгадныя сувязі. Але і па-за межамі гэтага важнага мерапрыемства рэгіёны шукаюць і знаходзяць важныя пункты судакранання. Бо найтанчэйшыя капіляры чалавечых адносін сілкуюць адзін аднаго заўсёды.

### БАРАНАВІЧЫ, ОБНІНСК, КУЗНЕЦК... І ІНШЫЯ

**Даўно і плённа супрацоўнічаюць Баранавічы з многімі рэгіёнамі Расіі. Паўтара года таму было падпісана пагадненне аб устанаўленні пабрацімскіх сувязяў паміж Баранавічамі і Обнінскам. Як паведамілі ў гарвыканкаме, бакі намецілі шляхі для супрацоўніцтва і рэалізацыі сумесных праектаў у галіне эканомікі, прамысловасці, будаўніцтва, транспарту, ЖКГ. Цяпер ідзе работа па ўвасабленні асобных планаў у жыццё.**



Трактар «Беларус», зроблены на Чарапавецкім ліцейна-механічным заводзе.

Обнінск — другі па велічыні горад у Калужскай вобласці, як і Баранавічы — у Брэсцкай. Падабенства гарадоў назіраецца і па колькасці насельніцтва, і па структуры эканомікі. Обнінск — горад навуковых цэнтраў, навукова-даследчых інстытутаў, горад энергетыкаў і фізікаў. Падчас візіту ў Баранавічы расійскія партнёры праявілі цікавасць да індустрыяльнага парка, што ствараецца ў горадзе. Работа па ўзвядзенні першага корпуса індустрыяльнага парка «Бурштын», які з'яўляецца філіялам Брэсцкага навукова-тэхналагічнага парка, завяршаецца. З'явіліся першыя рэзідэнты. Цалкам верагодна, што ў перспектыве спіс рэзідэнтаў папоўніцца прадпрыемствамі з горада-пабрацімa.

Гэта пытанне ўздымалася на расійска-беларускім форуме, які арганізавала Обнінская гандлёва-прамысловая палата мінулай восенню. Асаблівая ўвага на мерапрыемстве была ўдзелена дзейнасці індустрыяльных паркаў.

Асобным раздзелам у справе супрацоўніцтва гарадоў ідзе сумесная работа ў сацыяльнай сферы і культурны абмен.

— Цяпер у Баранавічаў каля двух дзясяткаў гарадоў-пабрацімаў, у тым ліку 9 з Расіі, — сказаў карэспандэнту газеты **старшыня Баранавіцкага гарадскога Савета Віктар КАЛАСОЎСКІ**. — Нярэдка сяброўскія сувязі завязваюцца падчас форумаў рэгіёнаў Беларусі і Расіі, затым працягваюцца абменамі дэлегацый, падпісаннем пагадненняў аб супрацоўніцтве.

Скажам, з Кузнецкам Пензенскай вобласці пабрацімскія сувязі былі аформлены тры гады таму. Члены дэлегацыі Кузнецка адразу паставілі пытанне аб супрацоўніцтве ў галіне культуры і спорту, турызму, гуманітарнага супрацоўніцтва. Мэр горада Кузнецка выказаў асаблівую падзяку жыхарам нашай вобласці за шанаванне памяці іх земляка, ураджэнца Пензенскай вобласці, начальніка Брэсцкай пагранзаставы Героя Савецкага Саюза Андрэя Кіжаватава — аднаго з кіраўнікоў абароны Брэсцкай крэпасці, які загінуў у чэрвені 1941 года. Турыстычныя групы з Кузнецка рэгулярна наведваюць Брэсцкую крэпасць.

На гэтым тыдні чакаецца візіт дэлегацыі Пензенскай вобласці на Брэстчыну. Супрацоўніцтва працягваецца.

### НОВЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ — НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

**Па выніках XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі 47 суб'ектамі гаспадарання Віцебскай вобласці было падпісана 394 камерцыйныя кантракты. Сума экспартных кантрактаў за студзень — ліпень 2024 года склала 59,3 мільярда расійскіх рублёў і звыш 338 тысяч долараў. У дні правядзення форуму васьмю суб'ектамі гаспадарання паўночнага рэгіёна было падпісана 11 кантрактаў на суму 174,9 мільёна расійскіх рублёў і 28,14 мільёна долараў.**

Акрамя камерцыйных дакументаў, Віцебскі аблвыканкам падпісаў 13 дакументаў аб супрацоўніцтве, у іх ліку — урадавы план мерапрыемстваў з Адміністрацыяй Валгаградскай вобласці, пагадненні аб супрацоўніцтве з урадамі Ніжагародскай і Арэнбургскай абласцей.

Пагадненні падпісалі Віцебск і Сімферопаль, Полацк і Кстова Ніжагародскай вобласці; Пастаўскі і Верхнядзвінскі раёны з Хвалынскім раёнам Саратаўскай вобласці, Аршанскі раён і Балашоўскі раён Саратаўскай вобласці, Наваполацк і Феадосія.

Супрацоўніцтва Віцебшчыны ажыццяўляецца з усімі Федэральнымі акругамі Расійскай Федэрацыі — а гэта 80 рэгіёнаў. Сыход заходніх пастаўшчыкоў і вытворцаў дазволіў у першую чаргу значна павялічыць прысутнасць віцебскіх вытворцаў на расійскім рынку. Наменклатура прадукцыі, якая адгружаецца ў рамках каапераацыйных паставак арганізацыямі вобласці, налічвае звыш 100 найменняў: гэта гандлёвае абсталяванне, ветэрынарныя прэпараты, кандытарскія вырабы, камплектавальныя для абутку і сельскагаспадарчай тэхнікі і інш.

На тэрыторыі вобласці рэалізоўваецца шэраг буйных інвестыцыйных праектаў, у якіх задзейнічаны расійскі капітал. Сярод іх — развіццё абутковай вытворчасці на «Белвест», развіццё вытворчасці маналітных кандэнсатараў на ААТ «Віцебскі завод радыёдэталяў «Маналіт», стварэнне вытворчасці гатовых металаканструкцый на Наваполацкім заводзе тэхналагічных металаканструкцый, стварэнне вытворчасці ветэрынарных прэпаратаў на «Вік — здароўе жывёл», развіццё вытворчасці аптычнага кабелю ў «Саюз кабель», развіццё вытворчасці кампрэсійных фіцінгаў з поліпрапілену, стварэнне вытворчасці металаапрацоўчых станкоў на плошчах завода «ВІЗАС».

### СЛАЎГАРАД — АРЗАМАС: ЗАХАВАННЕ АГУЛЬНАЙ ПАМЯЦІ

**Пачатак адносін паміж беларускім райцэнтрам і расійскім горадам Ніжагародскай вобласці быў пакладзены ў 2009 годзе, у аснову іх лягла патрыятычна-выхаваўчая дзейнасць. Сёння гарады асабліва цесна супрацоўнічаюць у пошукавым руху. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ў Слаўгарадскім раёне ваявалі байцы 137-й стралковай дывізіі, сфарміраванай у Горкаўскай на той момант вобласці. У 624-ы стралковы полк гэтай дывізіі ўваходзілі выключна арзамасцы.**

25 чэрвеня 1941 года дывізія адправілася на абарону Беларусі. Яна павінна была спыніць наступленне танкавых часцей Гудэрыяна. На жаль, з-за розных неспрыяльных абставін, якія склаліся ў першыя дні вайны, дывізія высаджвалася разрознена. Штаб спрабаваў сабраць падраздзяленні, але безвынікова. У першыя баі яны ўступілі паасобку. 314 тысяч чалавек, якія адправіліся на фронт у складзе гэтай дывізіі, 30 кастрычніка 1941 года засталося ўсяго толькі 860 чалавек. Лічы, уся дывізія палегла на беларускай зямлі. Яна дафарміроўвалася двойчы, удзельнічала ў вызваленні Беларусі, з баямі дайшла да Германіі. У 1944-м пры вызваленні Беларусі атрымала статус Бабруйскай.

— Сёлета да нас зноў плануюць прыехаць арзамаскія пошукавікі, — кажа **старшыня Слаўгарадскага райсавета Святлана ЯЗЕРСКАЯ**. — У складзе іх будуць і школьнікі з ліку членаў маладзёжнага ваенна-патрыятычнага клуба. Яны сустрэнуцца з нашымі падлеткамі з ваенна-патрыятычных клубаў, якія існуюць пры сярэдніх школах №№ 1 і 2. Гэта сустрэча прадугледжана планам, што агаворваўся падчас Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Дэлегацыя з Арзамаса дэкларавала на ім важнасць патрыятычна-выхаваўчай работы. І мы падтрымалі іх гатоўнасць працягнуць яе. Летась прадстаўнікі Арзамаса наведалі наш раён на чале з намеснікам кіраўніка адміністрацыі гарадской акругі Раманам Шаршаковым. Былі абмеркаваны планы, якія паступова рэалізоўваюцца. Наша моладзь сумесна ўдзельнічае ў захаванні памяці аб продках, якія разам абаранялі радзіму ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэта дапамагае ёй зразумець гісторыю і фарміраваць праўдзівае ўяўленне аб вайне. Сёлета ўдзельнікі клубаў на канкрэтнай рабоце будуць працягваць вывучаць хроніку вайны. Разам з настаўнікамі гісторыі пабываюць на месцы раскопак у Слаўгарадскім раёне і паназіраюць за сумеснай работай беларускіх і расійскіх пошукавікаў з удзелам 52-га асобнага пошукавага батальёна Мінабароны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*Працяг тэмы — на 2-й стар. «МС».*

2 красавіка
ДЗЕНЬ ЯДНАННЯ народаў Беларусі і Расіі

# «НОВАЯ ПРЫСТУПКА МІЖРЭГІЯНАЛЬНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА»

## Дэлегацыя жанчын-дэпутатаў Дзяржаўнага Савета Рэспублікі Татарстан наведвае Міншчыну



У рамках падпісанага на Форуме рэгіёнаў пагаднення паміж Мінскім абласным Саветам дэпутатаў і Дзяржаўным Саветам Рэспублікі Татарстан аб гандлёва-эканамічным, гуманітарным, навукова-тэхнічным супрацоўніцтве дэлегацыя жанчын-дэпутатаў Рэспублікі Татарстан гэтымі днямі наведвае Мінскую вобласць. Замежныя госці знаёмяцца з культурна-гістарычнай спадчынай Міншчыны, яе эканамічным, прамысловым і турыстычным патэнцыялам. У панядзелак дэлегацыя з Татарстана разам з кіраўніцтвам дэпутацкага корпуса Міншчыны наведалі знакавае для кожнага беларуса месца — мемарыяльны комплекс «Хатынь», азнаёміліся з яго трагічнай гісторыяй, аддалі даніну памяці, усклалі кветкі.

Тры гады таму ў Гродне было заключана пагадненне паміж Мінскім абласным Саветам дэпутатаў і Дзяржаўным Саветам Рэспублікі Татарстан, нагадала **член Савета Рэспублікі, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ**: «Гэта пагадненне датычыцца развіцця гандлёва-эканамічных, навукова-тэхнічных і гуманітарных узаемаадносін. Мы прапануем жанчынам-дэпутатам Рэспублікі Татарстан пазнаёміцца з нашай культурнай і гістарычнай спадчынай, а таксама з эканамічным патэнцыялам Мінскай вобласці».

Уздымаючы тэму Форуму рэгіёнаў, які мае адбыцца, сенатар адзначыла, што скарбонка пагадненняў паміж рэгіянальнымі суб'ектамі Беларусі і Расіі штогод папаўняецца: «Сёлета мы таксама будзем прымаць самы актыўны ўдзел у Форуме рэгіёнаў, які адбудзецца ў Ніжнім Ноўгарадзе. Штогод падчас форуму заключаем не менш за 2-3 пагадненні. У гэтым годзе з расійскага боку нам ужо прапанавана для падпісання чатыры пагадненні аб супрацоўніцтве. Мы падтрымліваем іх і абавязкова будзем працаваць у дадзеным кірунку. Мы не проста падпісваем пагадненні, а насамрэч стараемся забяспечыць узаемадзеянне па ўсіх напрамках. Па сутнасці, мы, парламентарыі, ствараем аснову, можна нават сказаць, падмурак для развіцця бізнесу. Мы павінны аказваць разнастайнае садзейнічанне малому і сярэдняму бізнесу. І такія кантракты якраз заключаюцца на форумах рэгіёнаў, прычым у вельмі вялікай колькасці».

Дэпутацкі корпус Міншчыны традыцыйна прымае актыўны ўдзел на такіх форумах і пляцоўках. «Гэта вялікі плюс для ўсёй нашай Беларусі. Вядома, мы не можам не ўлічваць той санкцыйны ціск, які аказваецца супраць нашай краіны. Таму стараемся развіваць нашу эканоміку ва ўсіх напрамках. Пры гэтым мы разумеем, што Расія сёння з'яўляецца галоўным стратэгічным партнёрам для Беларусі. І каму, як не нам, парламентарыям, займацца наладжваннем добрых дыпламатычных сувязяў паміж краінамі? Акрамя таго, гэтыя міжнародныя пагадненні моцна ўплываюць на эканоміку і прамысловасць», — паведаміла Наталля Якубіцкая.

Яна падкрэсліла, што аснову таکому міжрэгіянальнаму ўзаемадзеянню ствараюць менавіта на абласным узроўні: «Але сёння шчыльна супрацоўнічаць з расійскімі рэгіёнамі сталі і асобныя раёны Міншчыны. Напрыклад, два гады таму быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж Старадарожскім раёнам і Рыбна-Слабадскім раёнам Татарстана. Мы робім усё для таго, каб паказаць нашу краіну, каб пазнаёміць гасцей з нашай краінай, каб развіваць усе нашы эканамічныя сувязі, раскрываем свой патэнцыял, магчымасці, аказваем разнастайнае садзейнічанне. І вельмі важна тое, што сёння мы выйшлі на такую новую прыступку міжрэгіянальнага супрацоўніцтва».

### «ВА ЎСІХ У НАС АДНОЛЬКАВАЕ ПАЧУЦЦЁ — МЫ ПРЫЕХАЛІ ДА РОДНЫХ...»

«Нашы сувязі з Беларуссю — крайняй, якая нам асабліва дарагая, — вельмі блізкія, — падзялілася **намеснік старшыні Камітэта Дзяржаўнага Савета Рэспублікі Татарстан па адукацыі, культуры, навуцы і нацыянальных пытаннях Ірына ЦЯРЭНЦЬЕВА**. — Устойлівыя сувязі паміж Рэспублікай Татарстан і Мінскай вобласцю падкрэслівае і заключанае на Форуме рэгіёнаў пагадненне. І сёння мы працягваем актыўна ўзаемадзейнічаць з Міншчынай, падтрымліваць адзін аднаго. Мы супрацоўнічаем у прамысловасці, сацыяльнай і многіх іншых сферах. Мы прыехалі ў Беларусь толькі ўчора, і ва ўсіх у нас аднолькавае пачуццё, што мы прыехалі да родных. Гэта на самай справе так. Бачым, якія вялікія змены адбываюцца ў вас ў лепшы бок. З кім бы мы ні сустракаліся тут, усюды адчуваем беларускую дабрыню і гасціннасць».

Ірына Цярэнцьева падкрэсліла, што сёлета брацкія народы адзначаюць 80-годдзе з Дня Перамогі: «Таму для нас вельмі важна наведванне такога мемарыяльнага комплексу, як «Хатынь». Вядома, Беларусь самай першай адчула на сабе націск фашыстаў, вельмі моцна пацярпела ад Вялікай Айчыннай вайны. Але паглядзіце, якая ў вашага народа чалавечая стойкасць. Выжыць ва ўсім гэтым пекле і так трывала ўстаць на ногі дадзена не кожнаму народу».

**Дэпутат Дзяржаўнага Савета Рэспублікі Татарстан Вольга ВОРАНАВА** заўважыла: «Галоўнае цяпер — распавядаць нашым дзецям пра тую вайну, правільна іх выхоўваць. Патрыятычнае выхаванне вельмі важна для Рэспублікі Татарстан і для ўсёй Расіі ў цэлым. І тое, што ў Беларусі захавалася гэтая пераемнасць, захавалася павага і памяць, вельмі радуе. Дзякуй вялікаму беларускаму народу за тое, што вы захоўваеце гісторыю, што паважаеце гісторыю і што вы разам з Расіяй».

Паводле яе слоў, вялікая ўвага ў Рэспубліцы Татарстан аддаецца міжрэгіянальнаму супрацоўніцтву, падтрыманню цёплых узаемаадносін паміж нашымі народамі: «Літаральна на наступным тыдні ў Мінск прыязджае дэлегацыя казанскіх дэпутатаў. Узаемавыгадныя адносіны і ў плане эканомікі, і ў плане развіцця нашых краін вельмі важныя. Але не менш важным складнікам з'яўляецца і азнаямленне з вашай патрыётыкай. У нас, на жаль, няма такога выдатнага музея, як музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску. Таму для нас важна захоўваць пераемнасць і пераносіць ваш станоўчы вопыт у наш рэгіён».

Дэлегацыя жанчын-дэпутатаў Татарстана наведала таксама аб'екты аграэкатурызму, правяла круглы стол на тэму «Роля жанчыны ў сучасным грамадстве» на базе тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Мінскага раёна ў вёсцы Бараўляны. «Гэта новы тэрытарыяльны цэнтр, які быў адкрыты два месяцы таму. ТЦСАН Мінскага раёна — вельмі важны, значны для нас сацыяльны аб'ект. І нам сапраўды ёсць што паказаць і абмеркаваць», — падагульніла Наталля Якубіцкая.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Управление механизации № 91», г. Минск, ул. Бабушкина, 17, пом. 3 |
| **Оператор / Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов:**

**Полуприцеп платформа MAZ 5247 d,**
№ кузова 9011, р/з 6793 АА-7, 1990 г. в., инв. № 60061, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 17 (производственная территория).
**Начальная цена лота с НДС 20 % – 25 908,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять)** календарных дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи. Расходы за снятие с учета/регистрации несутся покупателем

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязаны возместить затраты продавцу за проведение независимой оценки и затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **7 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее, чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 10.03.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 15.04.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 14.04.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**



**ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, BELTORGI.BY.

Продавец: **ОАО «СДСК»** (УНП 400024628) 247439, Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 10, в лице антикризисного управляющего ООО «Правовая стратегия», тел. 8 02342 91199.

Четвертые повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **17 апреля 2025 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

| № п/п | Предмет торгов | Цена предмета торгов с НДС, руб. |
|---|---|---|
| 1 | Грузовой самосвал МАЗ 5551 А2-320, 2008 г/в, цвет белый, кузов (рама) У3М5551А280001347, макс. масса 18200 кг, масса без нагрузки 8200 кг, рег. номер АВ 7316-3, свидетельство о рег. ЕНА 023386, инв. № 2468 | 7260,00 |
| 2 | Автобус (вагон) МАЗ-226060, 2009 г/в, цвет зеленый, кузов (рама) У3М22606090000045, макс. масса 12600 кг, масса без нагрузки 8380 кг, 31 пассажирское место, рег. номер АЕ 2843-3, свидетельство о рег. ЕНА028326, инв. 2483 | 28380,00 |
| 3 | Легковой ВАЗ 21099, 1997 г/в, цвет вишневый, кузов (рама) ХТА210990V2039893, макс. масса 1370 кг, масса без нагрузки 995 кг, рег. № 7136 ЕХ, свидетельство о рег. НВ № 002143, инв. 2425дск | 1020,00 |
| 4 | Автобус (вагон) КАВЗ 3976 20, 2003 г/в, цвет белый, кузов (рама) Х1Е39762030036014, Х1Е39762030036014, макс. масса 5870 кг, масса без нагрузки 4450 кг, 20 пассажирских мест, рег. № ЕС 0860, свидетельство о рег. ЕНА 000285, инв. 02430дск | 3180,00 |

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 03.04.2025 г. с 09.00 по 16.04.2025 г. до 16.00:

1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY,

2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB301218 54590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Тел. для ознакомления и осмотра +375 (29) 698-53-53.

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 18.02.2024 г.



ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

# МІЖНАРОДНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ, ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ, КЛОПАТ АБ ЛЮДЗЯХ

## На што скіравана ўвага членаў Савета Рэспублікі

● Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, галоўны ўрач Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы Аляксандр Карпіцкі з калегамі-медыкамі наведаў Бялград. Абмеркаваны магчымасці і перспектывы развіцця беларуска-сербскага супрацоўніцтва ў медыцынскай сферы.

* * *

● Члены Савета Рэспублікі прынялі ўдзел у пасяджэннях Пастаянных камісій Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, член Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі АДКБ па сацыяльна-эканамічных і прававых пытаннях Уладзіслаў Татарыновіч прыняў удзел у пасяджэнні названай камісіі. Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Алейнік прыняў удзел у пасяджэнні Пастаяннай камісіі ПА АДКБ па палітычных пытаннях і міжнародным супрацоўніцтве.

* * *

● Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Міхаіл Русы правёў асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у Петрыкаўскім раённым выканаўчым камітэце. «Людзі прыходзяць з пытаннямі, якія датычацца ўсіх сфер жыцця. Камунікат з людзьмі падчас асабістага прыёму садзейнічаюць умацаванню даверу да ўлады. Акрамя таго, магчымасць зірнуць на праблему на свае вочы часта вельмі важная для яе паспяховага вырашэння», — адзначыў парламентарый.

* * *

● Пад кіраўніцтвам намесніка Старшыні Савета Рэспублікі Сяргея Хаменкі і намесніка Старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Юрыя Вараб'ёва ў рэжыме відэа-канферэнц-сувязі адбылася рабочая нарада па падрыхтоўцы і правядзенні патрыятычнай экспедыцыі «Непакорныя», прымеркаванай да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. «Сімвалічна, што ініцыятыва аб правядзенні гэтай акцыі зыходзіць ад кіраўніцтва Данецкай Народнай Рэспублікі. Упэўнены, што такія маладзёжныя праекты садзейнічаюць развіццю маладзёжнага руху і недапушчэнню сцірання гістарычнай памяці. У маладзёжных кантактах — будучае супрацоўніцтва нашых дзяржаваў, непарушнае сяброўства беларусаў і расіян», — адзначыў Сяргей Хаменка. У экспедыцыі возьме ўдзел больш за 100 актывістаў маладзёжных і грамадскіх арганізацый, лідараў грамадскай думкі, студэнтаў універсітэтаў. Будзе пераадолены маршрут амаль 5 тысяч кіламетраў, наведана 14 гарадоў Беларусі і Расіі: ад Брэста да Севастопаля.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

# НЕ ТОЛЬКІ ПРАБЛЕМЫ, АЛЕ І ПРАПАНОВЫ

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

## З якімі пытаннямі звяртаюцца да дэпутата на Жлобіншчыне

У склад Жлобінскай выбарчай акругі № 40 уваходзяць горад Жлобін, Навамаркавіцкі, Кастрычніцкі, Стараруднянскі, Стрэшынскі і Пірэвіцкі сельсаветы. Агульная колькасць выбаршчыкаў — звыш 63 тысяч, таму для дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Аляксандра МАЛАБІЦКАГА работа з насельніцтвам мае надзвычай важны сэнс.



«Зразумець сутнасць кожнага пытання, з якім да мяне звярнуліся людзі, лічу ў сваёй дэпутацкай дзейнасці прыярытэтам. Вядома, што тыдня работы ў акрузе не хапае, каб удзяліць увагу жыхарам усіх сельсаветаў, аднак выкарыстоўваю гэты час з максімальнай карысцю: маніторынгі цэн, сустрэчы з працоўнымі калектывамі і прыёмы грамадзян. Падпісчыкі майго тэлеграм-канала бачаць, якімі мерапрыемствамі насычаны графік падчас кожнага візіту на Жлобіншчыну, аднак шмат работы застаецца і за кадрам, у прыватнасці вырашэнне пытанняў выбаршчыкаў з органамі мясцовай выканаўчай улады», — расказвае Аляксандр Аляксандравіч.

3 мая 2024 падчас асабістых прыёмаў грамадзян да дэпутата Малабіцкага паступіла 34 звароты ад грамадзян і адзін ад юрыдычнай асобы. Тэмы, з якімі звяртаюцца вяскоўцы і гараджане, тыповыя для ўсіх рэгіёнаў нашай краіны: якасць жыллёва-камунальнай гаспадаркі, стан дарог і пад'ездаў да вялікіх дамоў, правядзенне новай сеткі электраперадачы з мэтай усталявання электракатлоў. Падключыўшы спецыялістаў ЖКГ, удалося аказаць садзейнічанне жыхарам прыватнага дома ў мікрараёне індывідуальнай жылой забудовы «Заходні» ў павышэнні магутнасці электразабеспячэння, арганізаваць пад'езд да дома на вуліцы Савецкай, добраўпарадкаваць пешаходныя дарожкі па вуліцы Прамысловай, узмацніць вулічнае асвятленне каля прыватнага дома ў г. п. Стрэшын і іншае. «Даволі доўгі час на канчатковым аўтобусным прыпынку «Дэпо» на развароткай пляцоўцы было пакрыццё, якое хутка ператваралася ў ямы і гразь у непагадзь. Нарэшце пытанне з асфальтаваннем гэтага аб'екта вырашылася, што дазволіла павысіць не толькі якасць жыцця гараджан, але і давер выбаршчыкаў да дэпутацкага корпуса і мясцовай улады», — успамінае дэпутат.

Звяртаюцца да Аляксандра Аляксандравіча не толькі з праблемнымі пытаннямі, але і з прапановамі, што сведчыць аб павышэнні актыўнасці грамадзянскай пазіцыі насельніцтва і неабыякавасці да ўзроўню жыцця ў акрузе, развіцця краіны ў цэлым. Так, адзін з заяніўкаў прапанаваў унесці змяненні ў заканадаўства па павелічэнні тэрмінаў будаўніцтва жылога дома і аб дзяржаўнай падтрымцы на пачатковым этапе прадпрымальніцтва. Сумесна з Навукова-практычным цэнтрам праблем умацавання законнасці і правапарадку Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь вывучаецца пытанне аб аднаўленні ў назве «Азарыцкі лагер смерці» слова «канцэнтрацыйны» — у мэтах захавання гістарычнай праўды з такой прапановай звярнулася былая малалетняя вязніца гэтага лагера. У 2024 годзе пры фінансавай падтрымцы дэпутацкага корпуса з ліку работнікаў і кіраўнікоў Беларускага металургічнага завода напярэдадні 40-годдзя прадпрыемства была ўсталявана новая брэндзіраваная дзіцячая пляцоўка непадалёк ад фізкультурна-аздараўленчага комплексу.

«І гэта, я ўпэўнены, далёка не ўсё. Скарбонка добрых спраў у Жлобінскай выбарчай акрузе № 40 будзе поўніцца новымі здзейсненымі на карысць грамадзян. Галоўнае — выслухаць і прапусціць праблему праз сябе, знайсці правільнае рашэнне сумесна з органамі мясцовай улады і адказнымі арганізацыямі», — заключыў Аляксандр Малабіцкі.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

**Фота з архіва дэпутата.**

белагропромбанк
традиции будущего

**Вниманию акционеров открытого акционерного общества «Белагропромбанк»**

*Местонахождение общества: г. Минск, проспект Жукова, 3.*

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (далее – банк) сообщает, что согласно решению годового общего собрания акционеров банка от 26 марта 2025 года, протокол № 1, с 20 мая 2025 года, если иное не предусмотрено законодательством, банком будет осуществляться выплата дивидендов по итогам работы за 2024 год по привилегированным акциям из расчета 0,03 рубля на одну акцию, по простым (обыкновенным) акциям из расчета 0,00721 рубля на одну акцию.

Список акционеров банка, имеющих право на получение дивидендов, сформирован на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 24 февраля 2025 года.

Выплата дивидендов акционерам банка осуществляется:
- юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям в безналичном порядке в соответствии с законодательством;
- физическим лицам в безналичном порядке в соответствии с законодательством либо в установленном порядке наличными денежными средствами в банке.

**Дополнительную информацию можно получить по телефону: (8017) 229 64 10 или (8017) 229 64 20**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 2 от 17 января 2024 г. УНП 100693551.*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 2, УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «БЕЛХИМ», Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, 19. УНП 100122846 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

| № лот | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Полуавтоматич. флексограф. печат. просекательно-рилевочная машина, модель YKS-1225**, инв. № 323T | **58 680,00** |
| 2 | **Полуавтоматич. флексограф. печат. просекательно-рилевочная машина, модель BYKM-II 1200*1200**, инв. № 515T | **18 840,00** |
| 3 | **Пакетоделат. машина ZH-GJHD-800**, 2013 г. в., инв. № нф00068 | **30 889,92** |
| | **Лоты №№ 4 – 12 – стеллажи Praktisch пристенные** | |
| 4 | **Стеллаж с доп. стойкой** 2250*1250*770, инв. № 7002 | **847,36** |
| 5 | **Стеллаж** 2250*1250*570, 2250*1000*570, инв. № 7003 | **1 770,69** |
| 6 | **Стеллаж** 2250*1000*470, 2250*237*370, инв. № 7006 | **1 266,12** |
| 7 | **Стеллаж** 2250*1250*470, 2250*1000*470, 2250*1022*470, инв. № 7007 | **3 232,03** |
| 8 | **Стеллаж островной** 1500*1000*570 и 470, 1500*1330*470, инв. № 7008 | **1 519,03** |
| 9 | **Стеллаж островной** 1500*1330*570, 1500*1250*470, инв. № 7009 | **1 484,49** |
| 10 | **Стеллаж** 2250*1250*470, 2250*1000*470, 2250*665*470, инв. № 7010 | **1 568,51** |
| 11 | **Стеллаж** 2250*1000*470, 2250*665*470, инв. № 7011 | **2 387,52** |
| 12 | **Стеллаж с доп. стойкой** 2250*1000*470, инв. № 7012 | **1 017,12** |
| 13 | **Прицеп бортовой тентовый MAZ 870110,** 2015 г. в., р. зн. А7361 В-5 | **14 280,00** |
| 14 | **Автопогрузчик-1014**, инв. № ф12230 | **11 628,00** |
| 15 | **Сварочный агрегат АДД-400**, инв. № ф12400 | **2 550,00** |
| 16 | **Автопогрузчик CPCD15NRW3FV3000**, инв. № 9207 | **25 602,00** |
| 17 | **Автопогрузчик Mitsubishi FD20NT**, инв. № 320T | **32 538,00** |
| 18 | **Ополаскиватель ОПЛ-1** (адаптированный под бутылки 5 л) линия розлива масла и воды, инв. № 9498 | **9 486,00** |

Начальная цена снижена: по лоту № 1 – на 40 %, по лоту № 2 – на 80 %, по лоту № 3 – на 20 %, по лотам №№ 4–12 – на 5 %, по лотам №№ 13-18 – на 15 %. **Шаг аукциона – 5 %** от начальной цены

Местонахождение лотов №№ 1, 2, 17 – г. Минск ул. Бабушкина, 22, лотов №№ 4–12 – г. Минск, ул. Калиновского, 6, лотов №№ 3, 13–15 – Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 25, лотов № 16, 18 – Минский р-н, аг. Колодищи, ул. Чкалова, 58. Демонтаж, погрузка и транспортировка проводится за счет покупателя

**Задаток 10 % от начальной цены** в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: лоты №№ 1, 2 – 30 календарных дней, лоты №№ 3–18 – 10 календарных дней** после проведения аукциона.

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** 100 % оплата стоимости в течение **10 календарных дней** после заключения договора купли-продажи.

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги (www.ipmtorgi.by).
**Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (во вкладке «Документы»). Страница лота содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель торгов либо единственный участник, согласившиеся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязаны возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере от 4 % до 10 % от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения электронных торгов (информация на сайте ipmtorgi.by)

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 14.01.2025

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до момента определения победителя торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 17.04.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Дата и время окончания приема заявок** на участие в электронных торгах – принимаются **по 16.04.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by** |

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Казарэдаву Алегу Уладзіміравічу, старшыні Праўлення ААТ «Белінвестбанк», у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Агросервис»**
(УНП 700010487, г. Могилев, ул. А. Павлова, 7)

**Аукцион состоится 18.04.2025 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352**
(офис Организатора аукциона)

**Лот № 1: Изолированное помещение с инв. № 700/D-1599848 – Производственно-бытовой корпус,** назначение: помещение специализированное иного назначения, пл. 2598,00 кв. м, адрес: г. Могилев, ш. Славгородское, 44а.

**22/100 доли капитального строения с инв. № 700/С-117992 – Промышленная площадка для стоянки автомобилей**, назначение: сооружение специализированное транспорта, пл. 17110,5 кв. м, адрес: г. Могилев, ул. Академика Павлова, 7/5.

**Капитальное строение с инв. № 700/С-118290 – кирпичное ограждение,** назначение: сооружение благоустройства, протяженностью 115,7 м. Адрес: г. Могилев, ул. Академика Павлова, 7/9.

